## Вынікі дзейнасці за 2023 год

### Агульная дзейнасць

- Атрымалі **статус дабрачыннай арганізацыі** ў Эстоніі. Гэта дае магчымасць атрымаць падатковыя ільготы ў тым ліку і для тых, каму мы дапамагаем фінансава.
- Атрымалі **статус праваабарончай арганізацыі** і далучыліся да Прынцыпаў дзейнасці беларускіх праваабаронцаў.
- Чарговы (чацвёрты) раз атрымалі **экстрэмісцкую адзнаку**.
- Даучыліся да **Аб’яднання беларускіх арганізацыяў у Эстоніі.**

**Аналітыка і даследаванні культурніцкага поля** – важная частка працы Беларускай Рады культуры.

**У межах гэтай актыўнасці (I):**

- штоквартал публікавалі **аналітычныя матэрыялы** пра стан культуры ў розных яе сферах;
- вялі маніторынг рэпрэсіяў у культуры і сачылі за лёсамі рэпрэсаваных творцаў;
- стварылі маніфест “**Больш чым культура**”, які дэманструе нашае бачанне сённяшніх шляхоў развіцця беларускай культуры. На падставе Маніфесту распрацоўвалася Дарожная мапа ў справе падтрымання беларускай культуры;

## У межах гэтай актыўнасці (II):

- зафіксавалі аднаўленне даследніцкай працы ў сферы культуры і спрычыніліся да значнай часткі даследаванняў;
- правялі **круглы стол** “**Культурніцкія вынікі 2023 года: падзеі, тэндэнцыі, прагнозы**”;
- зрабілі кароткі агляд актуальных даследаванняў стану развіцця і ўмоваў функцыянавання беларускай культуры. Вынікі маніторынгаў, агляды і справаздачы ствараюць шырокае поле для вывучэння актуальнага культурніцкага дыскурсу, адказваюць на пытанне, як працуе сёння беларуская культура і падказваюць крыніцы, за якімі варта сачыць (**Беларускі ПЭН**, **Belarus Behive**, “Палітычная сфера”, **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі** ды інш.).

**Кірунак культурніцкай дыпламатыі і палітыкі ў 2023 годзе**

**У межах гэтай актыўнасці (I):**

- **кансультавалі Офіс Святланы Ціханоўскай** у справе замежных візітаў;
- супрацоўнічалі з **Аб’яднаным пераходным кабінетам Беларусі** і распрацоўвалі супольныя дакументы;
- рэпрэзентавалі Беларусь на каардынацыйнай сустрэчы **European Union National Institutes for Culture (EUNIC)** – аб’яднання культурніцкіх інстытутаў Еўропы;

## У межах гэтай актыўнасці (II):

- бралі ўдзел у **міжнародных канферэнцыях**, падчас якіх апавядалі пра стан беларускай культуры і наладжвалі міжнародныя сувязі (EU Consultative Group with representatives of Belarusian civil society and democratic forces, II Канферэнцыя беларусаў свету, Civil society organizations and political parties in Belarus and the countries of the Lublin Triangle and the military situation in Eastern Europe і інш.); на онлайн-канферэнцыі “Форум білоруського культурного спротиву”, якую зарганізаваў **полк Каліноўскага**, выступіў Сяргей Будкін;

## У межах гэтай актыўнасці (III):

- у межах дзейнасці ў кірунку культурніцкай дыпламатыі ладзілі кампанію **#art_born_Belarus**. Падрыхтавалі аргументацыю пра беларускае паходжанне шэрагу славутых мастакоў і мастацкіх твораў;
- праводзілі важныя перамовы з міжнароднымі культурніцкімі інстытутамі і ўстановамі, сярод якіх **Інстытут імя Гётэ, Літоўскі інстытут культуры, Міністэрства культуры Літвы** і інш.;
- працягвалі сталую супрацу з **Дацкім інстытутам культуры і NDF Даніі** ў межах супольнага праекту пяці краінаў рэгіёну "Усходняга партнёрства" і распачалі працу над праектам, што прысвечаны праблемам культурніцкай **дэкаланізацыі рэгіёну**;

**У межах гэтай актыўнасці (IV):**

- супольна з **CSN Lab** (армянскі партнёр) правялі адкрытыя прэзентацыі пра метадалогію дэкаланізацыі і зладзілі выставу “Паштоўкі са складанага мінулага”, якая таксама была прысвечаная тэме дэкаланізацыі;
- разам з партнёрамі **NDF** зарганізавалі і правялі (не)канферэнцыю на тэму культурніцкай дэкаланізацыі краінаў “Усходняга партнёрства” ва ўмовах вайны і палітычнага крызісу;
- **распачалі даследаванне** аб зборы і аналізе новых гібрыдных формаў культурнай ідэнтычнасці былых “малых” народаў. Пяць даследчых артыкулаў будуць апублікаваныя ў студзені – лютым 2024 года.

## Глабальныя акцыі і праекты

**На гэтым кірунку дзейнасці ў 2023 года мы (I):**

- дапамаглі зарганізаваць і знайсці фінансаванне для святкавання **Дня Волі** ў Коўне;
- далучыліся да **марафону салідарнасці “Нам не ўсё адно”**, падрыхтавалі інфаграфіку пра рэпрэсіі супраць дзеячаў культуры, правялі вечарыну, прысвечаную Алесю Пушкіну;
- у межах акцыі **“Ноч паэтаў”, ініцыяванай БРК у 2021 годзе**, сабралі на сайце акцыі інфармацыю пра 60 імпрэзаў, якія беларусы самастойна ладзілі па ўсім свеце (38 гарадоў, 15 краінаў). Таксама ў Гасцёўні адбылася літаратурна-музычная вечарына да Ночы паэтаў;

## На гэтым кірунку дзейнасці ў 2023 года мы (II):

- дзякуючы інстытуцыйнаму падтрыманню ад ArtPower Belarus для Беларускага моладзевага хабу ў Варшаве і фонду Tutaka прайшлі **Дні беларускай культуры – 2023** пад агульным слоганам **#SpeakBelarus**. Сёлета на мапе праекту адзначыліся 29 імпрэзаў, 10 гарадоў, 5 краінаў;
- Беларуская Рада культуры **спрыяе стварэнню і падтрыманню розных прафесійных супольнасцяў** у сферы культуры: ад літаратуры да тэатру.

## Сойм і дарожная мапа (I)

- Супольна з іншымі культурніцкімі ініцыятывамі (Беларускі ПЭН, Інстытут кнігі, Кінаакадэмія, ініцыятыўная група Інстытуту нацыянальнай памяці) і дзеячамі культуры **ацанілі патрэбы сферы культуры** і прэзентавалі вынік у Бруселі на SOM (Senior Officials' Meeting) 11 траўня 2023 года. Маем станоўчыя водгукі ад DG NEAR (Directorate-General for Neighbourhood and Enlargement Negotiations), рыхтуем наступныя крокі для перамоваў з Еўракамісіяй і краінамі – чальцамі Еўразвязу.

## Сойм і дарожная мапа (II)

- Правялі ўоркшоп для праектавання платформы культурніцкай палітыкі і каардынацыйных задачаў для беларускай культуры. Сфармавалі аргкамітэт будучай платформы, які працуе над стварэннем прататыпу кааліцыі культурніцкіх арганізацыяў.
- Прэзентавалі для Офісу Святланы Ціханоўскай і Каардынацыйнай рады ацэнку патрэбаў сферы культуры.

## Рэсурсны цэнтр

Шукаем і перакіроўваем сродкі, а таксама акумулюем магчымасці для розных сфераў культуры. Гэта, у прыватнасці, праца ў межах дапамогі рэпрэсаваным дзеячам культуры і конкурсу праектных прапановаў на грантавае падтрыманне **ArtPower Belarus**.

### Дапамога (I)

- Пракансультавалі 184 чалавек (візы, рэлакацыі, пошук фінансавага падтрымання і г. д.).
- 97 чалавек атрымалі візы ці віды на жыхарства.
- 28 кейсаў фінансавай дапамогі (з іх 11 сем'яў) на суму 52 406 еўраў.

## Дапамога (ІІ)

- 86 чалавек скіраваныя ў дабрачынныя праекты на атрыманне псіхалагічнай дапамогі.
- Падтрымліваем рэпрэсаваных дзеячаў культуры дзякуючы працы некалькіх валанцёраў, якія распрацавалі **гайд** пра магчымае падтрыманне дзеячаў культуры і займаюцца маніторынгам рэпрэсіяў.
- На снежань 2023 148 палітвязняў ад культуры.
- Зарганізавалі збор для Мікалая Зайца.
- Узялі ўдзел у марафоне салідарнасці “Нам не ўсё адно” і паспяхова прайшлі аўдыт. Агульная сума выплатаў склала 9 500 еўраў, дапамогу атрымалі 6 сем'яў палітычных вязняў.

## ArtPower Belarus

У 2023 годзе пачалі працаваць **офіс, Гасцёўня і сайт Рэсурснага цэнтру**, з дапамогай якога беларускі дзеяч культуры можа падаць заяўку на конкурс праектаў ArtPower Belarus ці скіраваць нашай камандзе запыт на персанальнае падтрыманне: візавае, фінансавае і кансультацыйнае.

Аб’явілі і правялі тры колы на конкурс праектаў для грантавага падтрымання. Цягам года ў межах ArtPower Belarus вылучаныя:

- **15 мідзі-грантаў** на агульную суму каля 440 000 еўраў;
- **18 міні-грантаў** на агульную суму 74 736 еўраў.

Праграмаю мабільнасці скарысталіся **150 дзеячаў беларускай культуры**. Яны наведалі арт-рэзідэнцыі, здзейснілі даследчыя вандроўкі ці ўзялі ўдзел у важных міжнародных прафесійных івэнтах.

Агулам на конкурс праектаў ArtPower Belarus **былі дасланыя 554 заяўкі** з агульным запытам на суму каля **12,3 мільёна еўраў**. У межах магчымасцяў ArtPower Belarus вылучаныя больш за 600 тысяч еўраў.

**У межах ArtPower Belarus таксама:**

- правялі **базавае даследаванне** асноўных актараў беларускай культуры, стану іх развіцця і магчымасцяў ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўмовах эміграцыі і татальнага ціску;
- правялі даследаванне з мэтаю вывучыць адукацыйныя патрэбы менеджараў культуры і склалі навучальны план, што ляжа ў аснову новай школы арт-менеджараў (старт – вясна 2024 года).

## Культурны код

- Падтрымалі кам’юніці творцаў і IT-спецыялістаў. Арганізавалі паблік-токі, майстармайнды і пітчынгі, на якіх былі прэзентаваныя агулам 15 культурніцкіх праектаў у сферы культурнай спадчыны, архітэктуры, турызму, музыкі, нефармальнай адукацыі, кіно, мультыплікацыі і розных інструментаў для падтрымання і развіцця культурніцкіх праектаў.

## Магістраты

- Стварылі сайт **mahistrat.byculture.org**
- Магістрат “Кнігаўка” завершыўся ў чэрвені 2023 года. За 6 месяцаў да магістрату далучыліся 325 чалавек. Сабралі больш за 23 тысячы еўраў.
- Магістраты “Спадчына” і ULegend на гэты момант падтрымліваюць 50 чалавек.

## Гасцёўня

- Правялі адкрыццё, у якім узялі ўдзел больш за 100 чалавек.
- Агулам правялі 31 сустрэчу і зафіксавалі прыблізна 600 наведванняў. У нас праходзілі стратэгічныя сесіі, прэзентацыі, ўоркшопы, публічныя івэнты, лекцыі, запісы ролікаў.

## Партнёрствa

- “**Васьміног**”. У межах партнёрства забяспечылі для “Васьмінога” інфармацыйную частку праекту: распрацавалі дызайн і сайт, вялі сацыяльныя сеткі, працавалі з медыямі, арганізоўвалі імпрэзы, а таксама распрацоўвалі канцэптуальныя дакументы.
- Праводзілі супольныя акцыі з праваабаронцамі, правялі круглы стол для праваабаронцаў, фондаў, медыяў, іншых грамадскіх арганізацыяў.